# ПРАБЛЕМА ЛАКАЛІЗАЦЫІ СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ ЛІТВЫ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ І РОЗНЫЯ ЗНАЧЭННІ ТЭРМІНА «ЛІТВА»

**Д. А. Кізін**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск*
*dmkizin@gmail.com;*
*навук. кір. – А. Р. Дзянісава, канд. гіст. навук, дац.*

Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы лакалізацыі сярэднявечнай Літвы ў гістарыяграфіі і розных значэнняў гэтага гістарычнага тэрміна. Галоўная ідэя заключаецца ў тым, што тэрмін «Літва» на працягу 2-га тысячагоддзя прайшоў складаную храналагічную эвалюцыю.

***Ключавыя словы:*** лакалізацыя Літвы; «Літва» ў вузкім сэнсе; «Літва» ў шырокім сэнсе; этнонім «Літва»; харонім «Літва»; палітонім «Літва»; Аўкштота.

Першая вядомая гісторыкам згадка пра Літву ў пісьмовых крыніцах знойдзена ў Кведлінбургскіх аналах пад 1009 г. Тэрмін «Літва» таксама ўпамінаецца і ва ўсходнеславянскіх летапісах XII–XIII стст. Важная інфармацыя па гісторыі і геаграфіі Літвы ўтрымліваецца і ў некаторых крыжацкіх хроніках XIII ст.

Даследчыкі адзначаюць, што ў пісьмовых крыніцах XII–XIII стст. тэрмін «Літва» выступае як назва памежнай балцкай вобласці з усходнімі славянамі («Літва» ў вузкім сэнсе) і адначасова як агульная назва ўсіх літоўскіх земляў («Літва» ў шырокім сэнсе). Падобную двухсэнсоўнасць яны тлумачаць слабай знаёмасцю тагачасных аўтараў з рознымі плямёнамі балтаў Панямоння. Летапісцы, засвоіўшы назву пагранічнага усходнімі славянамі племені, пераносілі яе і на сваякоў-суседзяў літвы [1, с. 96].

На думку беларускага гісторыка А. Краўцэвіча, паняцце «Літва» на працягу 2-га тысячагоддзя прайшло складаны шлях развіцця. Ён адзначае, што ў ходзе гэтай храналагічнай эвалюцыі тэрмін «Літва» набыў тры сэнсавыя значэнні:

этнонім, ці «Літва» ў этнаграфічным сэнсе як балцкае племя;

харонім, ці «Літва ў вузкім сэнсе», «уласна Літва», «гістарычная Літва» – гістарычны цэнтр дзяржавы;

палітонім, ці абазначэнне ўсёй дзяржавы ВКЛ [1, с. 97].

У гістарыяграфіі часта блытаецца монаэтнічнае (балцкае) разуменне тэрміна «Літва» з аднайменным сярэднявечным харонімам – ядром ВКЛ. На думку таго ж А. Краўцэвіча, на сярэднявечча пераносіцца сітуацыя XX ст., калі названы тэрмін замацаваўся за этнічна балцкай тэрыторыяй. У выніку ўзнікаюць праблемы з адэкватнай ацэнкай сутнасных момантаў гісторыі ВКЛ [1, с. 97–98].

Расійскі гісторык, аўтар фундаментальных прац па гісторыі ВКЛ М. Любаўскі ўпершыню заўважыў, што назва «зямля Літоўская» ў дакументах XIV–XVI стст. даволі часта абазначае не ўсю дзяржаву, а толькі яе частку, асобную ад усіх астатніх абласцей. Даследчык называе гэтую «ўласна Літоўскую зямлю» ядром, цэнтральнай вобласцю Літоўска-Рускай дзяржавы. Ён таксама прыйшоў да высновы, што першапачаткова пад гэтай назвай разумелася вобласць правых прытокаў Нёмана, пераважна ракі Віліі, населеная так званай «верхняй Літвой». Але ўжо з другой паловы XIII ст., як сцвярджае гісторык, назва «зямля Літоўская» нават у вузкім сэнсе выйшла за межы гэтага першапачатковага абазначэння і распаўсюдзілася на некаторыя рускія (беларускія) тэрыторыі, занятыя літвой. Гэта так званая Чорная Русь – вобласць на левых прытоках Нёмана з гарадамі Наваградкам, Ваўкавыскам, Слонімам, Здзітавам і Гародняй [1, с. 98; 2, с. 2–5].

У канцы XX ст. лакалізацыяй гістарычнай Літвы, а таксама Русі ў XVI ст. дэталёва займаўся М. Спірыдонаў. Для акрэслення межаў названых рэгіёнаў ён выкарыстоўвае пісьмовыя крыніцы, якія прама ці ўскосна сведчаць аб месцазнаходжанні канкрэтнага населенага пункта на Русі або на Літве. Паводле М. Спірыдонава, у XVI ст. сучаснікі адносілі да Літвы перш за ўсё этнічна літоўскія Віленскі, Вількамірскі, Ковенскі, Троцкі і Упіцкі паветы, а таксама поўнасцю ці часткова «беларускія» паветы ВКЛ: Браслаўскі, Віленскі, Ваўкавыскі, Гарадзенскі, Лідскі, заходнюю частку Менскага, большую частку Наваградскага, амаль увесь Ашмянскі і Слонімскі. Трэба таксама прывесці важную выснову даследчыка, што гістарычныя рэгіёны ВКЛ істотна не супадалі з этнічнымі тэрыторыямі насяляўшых яго розных этнасаў. Такім чынам, можна канстатаваць, што выснова М. Любаўскага аб існаванні ў XIV–XVI стст. «ўласна Літвы», ці ядра ВКЛ, з балта-славянскім насельніцтвам пацвярджаецца навейшымі даследаваннямі [1, с. 100–101].

Даследчыкі, якія займаліся лакалізацыяй Літвы XII–XIII стст., як правіла, шукалі яе на тэрыторыі сённяшняй этнічнай Літвы. Дэталёва распрацаваную лакалізацыю Літвы XIII ст. прапанаваў польскі гісторык Г. Лаўмяньскі, які лічыў гэтую тэрыторыю выключна балцкай. Ён прапанаваў распрацаваную ім палітычную геаграфію балцкіх плямёнаў, якая не страціла актуальнасці і да сённяшняга часу. Лакалізацыя палітычна-тэрытарыяльных адзінак у гэтай рэканструкцыі ў шэрагу выпадкаў даведзена да найдрабнейшага ўзроўню – акруга вакол гарадзішча. Адзінка першага ўзроўню – саюз плямёнаў пад назвай «Літва», складалася з двух плямёнаў – жамойтаў і аўкштайтаў (другі ўзровень). Потым ішлі землі (трэці), валасці (чацвёрты) і акругі (пяты).

«Літва ў вузкім сэнсе», ці «ўласна Літва», згодна з даследчыкам, была адной з трох ці чатырох земляў Аўкштоты [1, с. 104–105].

Як вядома, пісьмовыя крыніцы ўтрымліваюць толькі ўскосную інфармацыю аб размяшчэнні асобных земляў Аўкштоты. Так, можна з упэўненасцю вывесці, што з Лівоніяй межавала Нальшчанская зямля, а далей углыб Аўкштоты, гэта значыць на поўдзень ад Нальшчанаў, знаходзілася Літоўская зямля. Аб размяшчэнні Дзяволтвы няма нават ускосных сведчанняў, але, ведаючы прыблізнае размяшчэнне Нальшчанаў і Літвы, можна вывесці, што яна знаходзілася ў цэнтры ці ў заходняй частцы Аўкштоты. Г. Лаўмяньскі лакалізуе яе па населенаму пункту Дзевалтова. У існаванні Упіцкай зямлі сам гісторык не да канца ўпэўнены, бо ў крыніцах яна ўпамінаецца толькі аднойчы. Праз паўстагоддзя пасля Г. Лаўмяньскага да такіх жа самых высноў прыйшоў літоўскі гісторык Э. Гудавічус [1, с. 105].

Разам з тым, на думку гісторыка В. Насевіча, у сярэдзіне XIII ст. назва «Літва» ў вузкім сэнсе магла адносіцца і да непасрэдных уладанняў Міндоўга. Даследчык абапіраецца на згадку пра «літву Міндоўга» ў Галіцка-Валынскім летапісе пад 1238 г. В. Насевіча мяркуе, што яна знаходзілася недзе на поўдзень ад Нальшчанскай зямлі, бо праз апошнюю ішоў паходам лівонскі ландмайстар далей на Літву ў 1250 г. [3, с. 68].

Арыгінальную версію лакалізацыі Літвы XII–XIII стст. прапанаваў М. Ермаловіч. У адрозненне ад іншых даследчыкаў гэты гісторык знайшоў летапісную Літву не ў сучаснай краіне Літве, а на тэрыторыі Беларусі. Галоўная ідэя М. Ермаловіча заключалася ў тым, што летапісная Літва – гэта найбольшы востраў балцкага насельніцтва сярод славянскіх тэрыторый, дакладней, «яна ўрэзвалася клінам паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Новагародскай землямі і побач з імі з'яўляецца адной з гістарычных абласцей Беларусі» [4, с. 34]. Для сваёй лакалізацыі М. Ермаловіч выкарыстаў сведчанні пісьмовых крыніц і размяшчэнне тапонімаў «Літва». Як заўважае А. Краўцэвіч, абапіраючыся на ўказаныя даследчыкам летапісныя звесткі, можна з такой жа малой верагоднасцю лакалізаваць Літву ў зусім іншым месцы. Археалагічныя даныя нам не дазваляюць казаць аб якім-небудзь значным востраве балцкага насельніцтва ў пазначаным месцы [1, с. 108].

У гістарыяграфіі ў пэўнай ступені таксама выклікае блытаніну ва ўжыванні паняцце «Аўкштота». Гісторыкі не могуць узгадніць паміж сабой балцкую Аўкштоту і балта-славянскую Літву, патлумачыць, дзе яны размяшчаліся і што сабой абазначалі. Выходзіла так, што Літва адначасова была часткай Аўкштоты і ў той жа час уключала ў сябе Аўкштоту разам з Жамойцю. А. Краўцэвіч мяркуе, што Літва

(«Літоўская зямля») напачатку была паўднёвай, пагранічнай з усходнімі славянамі вобласцю Аўкштоты. Усходнія славяне, а за імі палякі і немцы пачалі называць імем гэтай пагранічнай балцкай зямлі суседнія ёй і этнічна блізкія тэрыторыі. Назва «Аўкштота» выкарыстоўвалася на Жамойці, адкуль пра яе даведаліся нямецкія храністы з суседняй Прусіі. У ходзе славянскай каланізацыі, а потым працэсу ўтварэння ВКЛ назва «Літва» пашырылася на ўсю кантактную балта-славянскую зону, стаўшую ядром дзяржавы. Паколькі ў гэтае ядро ўвайшлі і астатнія землі Аўкштоты, назва «Літва» распаўсюдзілася таксама і на іх. Такім чынам Аўкштота стала часткай Літвы і захавалася як харонім у мове насельнікаў Жамойці. Да таго ж Г. Лаўмяньскі заўважыў, што ўсходнеславянскія крыніцы ўвогуле не ведаюць назвы «Аўкштота», можа быць таму, што ўсходнеславянскія землі межавалі непасрэдна з Літвой, а не з Жамойцю [1, с. 112–113].

Такім чынам, можна падсумаваць, што тэрмін «Літва» прайшоў доўгую і складаную эвалюцыю. Сярод гісторыкаў да сённяшняга часу не выпрацавана адзінага падыходу да лакалізацыі сярэднявечнай Літвы і да ўжывання гэтага тэрміна. Спачатку тэрмінам «Літва» называлася адно з балцкіх плямён і адпаведная тэрыторыя, якую яно займала. Лакалізацыя гэтай першапачатковай Літвы акрэслена толькі прыблізна – вобласць правых прытокаў Нёмана, пераважна ракі Віліі. Па меры разгортвання дзяжаватворчага працэсу з другой паловы XIII ст. назва «Літва» распаўсюдзілася на ўсё Верхняе і Сярэдняя Панямонне. Гэты тэрмін складаўся ўжо не толькі з балцкай этнічнай часткі, але і з усходнеславянскай. Месцазнаходжанне Літвы ў XVI ст. даволі дакладна вызначана апошнімі даследаваннямі гісторыка М. Спірыдонава – Гарадзеншчына, Наваградчына, Віленшчына і заходняя частка Міншчыны.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Краўцэвіч А. К.* Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Беласток: Вышэйшая Школа Публічнай Адміністрацыі імя Станіслава Сташыца, 2008.
2. *Любавский М. К.* Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута. М.: Университетская типография, 1893.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск: Экоперспектива, 2008.
4. *Ермаловіч М. І.* Па слядах аднаго міфа. Мінск: Беларуская навука, 2002.